Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 СНЕЖНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 245 (28355)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Баявы сцяг — ВПС і войскам СПА**

СТАР. 3

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



**Пасол Кыргызстана — пра тое, што нас звязвае**



**Як адзначаюць Новы год у краінах ЕАЭС?**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Барыс СВЯТЛОЎ, міністр культуры:**

*«Сёння неабходна весці гаворку аб сферы культуры як аб індустрыі, здольнай зарабляць, што прадугледжвае павелічэнне долі ўласных даходаў, больш актыўнае прывабліванне спонсараў, недзяржаўнага сектара эканомікі ў развіццё галіны. Сфера культуры ніколі не стане камерцыйнай, гэта датуемая з бюджэту галіна. Але задача павышэння долі ўласных даходаў ад пазабюджэтнай дзейнасці актуальная. Доля ўласных даходаў па галіне сёння складае 20%. Да 2020 года плануецца павялічыць удзельную вагу ўласных даходаў ад пазабюджэтнай дзейнасці да 40% ад агульнага аб'ёму фінансавання культуры».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9715 | ▼ |
| Еўра | 2,0632 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0319 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0747 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ЦЁПЛАЯ ВАДА ЎЛАСНАЙ КРЫНІЦЫ



Трэцюю зіму жыхар Мінска Віктар ГАЛУБОВІЧ загартоўваецца ля крыніцы, якая б'е з-пад берага Свіслачы і зімою не замярзае. Гэтую крыніцу ён адшукаў выпадкова, акультурыў, улетку абклаў камянямі, выкапаў, зрабіў купель і цяпер кожныя выхадныя, у любое надвор'е, прыходзіць абліваецца і апускацца ў ваду. Па словах Віктара Аляксандравіча, ён амаль 30 гадоў вядзе здаровы лад жыцця, а загартоўванне дапамагае пераадольваць эпідэміі і хваробы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ «Звязда» даследуе праблему

## ДОМ ЛЯ ДАРОГІ

### Літаратурны музей Максіма Гарэцкага можа пераехаць у Мсціслаў

**Гэта тэма ўжо трэці месяц абмяркоўваецца ў інтэрнэце. Нагодай стаў электронны ліст мінчанкі ў Мсціслаўскі райвыканкам, якая прапанавала перанесці драўляную хату музея з Малой Багацькаўкі ў горад. Гэта, на яе погляд, дапаможа як мага большай колькасці людзей далучыцца да творчасці вядомага беларускага пісьменніка. Прапанова была вынесена на грамадскае абмеркаванне і выклікала буру эмоцый. Адны за тое, каб гістарычны Мсціслаў, дзе і так ёсць паглядзець шмат чаго каштоўнага і ўражлівага, прыдбаў сабе яшчэ і літаратурны музей. Іншыя — катэгарычна супраць. Маўляў, страціцца тая невымоўная аўра, якая захоўваецца ў вёсцы. Карэспандэнт «Звязды» пабывала на месцы, каб разабрацца ў гэтай складанай сітуацыі.**

СТАР. 4



■ Блізкая ўлада

## «Вечная» камуналка і нязручнасці аптымізацыі

**У мінулую суботу на прамой тэлефоннай сувязі з жыхарамі сваіх рэгіёнаў былі тры старшыні аблвыканкамаў: Уладзімір ДВОРНІК, Анатоль ЛІС і Мікалай ШАРСТНЁЎ. Уласныя карэспандэнты «Звязды» абагульнілі тыповыя пытанні і адзначылі тэндэнцыі ў вырашэнні праблем, з якімі людзі звяртаюцца да выканаўчай улады.**

### Будуйце лазні, а лепш — не закрывайце іх

Вершаваны заклік Кандрата Крапівы не страціў актуальнасць. Класік заклікаў адкрываць лазні ў вёсках. Іх амаль за сто гадоў і адкрылі нямала. А цяпер вось у многіх месцах закрываюць. Кажуць, што нерэнтабельна. Але не ўсе жыхары маленькіх вёсак і аграгарадкоў з гэтым пагаджаюцца.

Вось і **старшыні Брэсцкага аблвыканкама Анатолю ЛІСУ** ў мінулую суботу пазванілі аж шэсць чалавек з аналагічнай просьбай: дайце ўказанне раённым службам, каб пакінулі любімую многімі ўстанову гігіены і здароўя функцыянаваць. На гэту тэму былі званкі з Івацэвіцкага, Брэсцкага, Жабінкаўскага, Баранавіцкага раёнаў. Некаторыя пачыналі гутарку крышачку здалёк, напрыклад, так: «Ці любіце вы, шаноўны губернатар, папарыцца ў лазні?» Іншыя выказваліся катэгарычна, маўляў, завышаюць цэны на чалавека-памыўку спецыялісты ЖКГ, таму і людзей мала ходзіць, а лазня становіцца стратнай. Другія ж проста прасілі: калі можна, паспрыяйце, каб арганізавалі работу лазні хоць два разы на месяц... У кожным выпадку кіраўнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі атрымалі ўказанне падысці вельмі ўважліва. І калі толькі ёсць мінімальная магчымасць, лазні пакінуць у вёсцы, калі ж гэта надзвычай праблематычна, важна арганізаваць падвоз людзей у суседнія. Асабліва перад святам.

СТАР. 2

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# БЕЗ ПАПЯРЭДНІХ УМОЎ

## Мы гатовы развіваць супрацоўніцтва з Малайзіяй

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы са спікерам Палаты прадстаўнікоў парламента Малайзіі Пандзікарам Амінам Муліа.**

«Мы вельмі зацікаўлены ў развіцці адносін з вамі. Зацікаўлены, таму што вы не прад'яўляеце нам ніякіх папярэдніх умоў, не ставіце іх перад намі, як гэта робяць некаторыя. Мы гэтак жа не маем абсалютна ніякіх прэтэнзій да вас, гэтак жа не будзем абумоўліваць нашы адносіны нейкімі пунктамі. Гатовы прадаўжаць супрацоўніцтва на аснове таго фундамента адносін, які ў нас склаўся», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што паміж краінамі склаліся добрыя ўзаемаадносіны. Дзяржавы маюць, нягледзячы на геаграфічную аддаленасць, даволі высокі тавараабарот. «Адзіны недахоп, што вельмі вузкая яго наменклатура. У бліжэйшы час нам трэба будзе заняцца менавіта гэтым пытаннем», — адзначыў Прэзідэнт, дадаўшы, што не менш важнае і палітычнае супрацоўніцтва, у тым ліку міжпарламенцкае. «У сучасным свеце міжнароднай дыпламатыя мае вельмі вялікае значэнне, адыгрывае вялікую ролю. Вярхоўны народны дыпламатыяў з'яўляецца міжпарламенцкае супрацоўніцтва, таму што дэпутаты прадстаўляюць інтарэсы народаў нашых краін. Вы прыехалі вельмі своечасова: мы нядаўна выбралі новы парламент. І мы, вядома ж, будзем фарміраваць у нашым парламенце групу сяброў з вашай краінай», — звярнуў увагу беларускі лідар.

Прэзідэнт выказаў надзею, што Пандзікар Амін Муліа ў час візіту ў Беларусь пазнаёміцца не толькі з краінай, але і з яе эканомікай. «Калі штосьці можам для вас зрабіць, мы абавязкова зробім», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу спікер Палаты прадстаўнікоў парламента праінфармаваў Аляксандра Лукашэнку, што паміж Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і Палатай прадстаўнікоў парламента Малайзіі быў падпісаны мемарандум аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве. «Хацеў бы запэўніць вас, што мы як заканатворцы будзем падтрымліваць любыя дамоўленасці, якія будуць дасягнуты паміж урадамі», — заявіў Пандзікар Амін Муліа.

У час сустрэчы абмяркоўвалася развіццё супрацоўніцтва па розных напрамках, у тым ліку ў сферах прамысловасці, турызму, адукацыі, высокіх тэхналогій, ваенна-прамысловага комплексу, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Бакі выказалі зацікаўленасць у стварэнні сумесных прадпрыемстваў, падкрэслілі неабходнасць пашырэння дагаворна-прававой базы адносін і нарошчвання міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння.

Было адзначана, што праграпоўваецца візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Малайзію. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы даручыў падрыхтаваць да яго насычаны парадак дня па ўсіх напрамках супрацоўніцтва.

## ПРАЦА ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ КАДРАЎ

У гэтым кірунку супрацоўніцтва можна праводзіць больш інтэнсіўна. Пра гэта ішла размова на сустрэчы **старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіла МЯСНІКОВІЧА** са спікерам Палаты прадстаўнікоў парламента Малайзіі Пандзікарам Амінам Муліа. Міхаіл Мясніковіч прапанаваў спікеру Палаты прадстаўнікоў Малайзіі дэталёва абмеркаваць пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай спецыялістаў як на ўніверсітэцкім узроўні, так і навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Беларусь і Малайзія прапрацоўваюць некалькі пагадненняў паміж ВНУ, і парламентарыі маглі б паскорыць гэты працэс. Ён перакананы, што ўзмацненне ўзаемадзеяння ў падрыхтоўцы кадраў дапамагло б развіццю палітычных, гандлёва-эканамічных адносін.

Міхаіл Мясніковіч запэўніў малайзійскага госця, што дамоўленасці, дасягнутыя ў тым ліку з Палатай прадстаўнікоў, будуць у поўным аб'ёме выконвацца і сіламі Савета Рэспублікі.

## АСНОВА ДЛЯ ДЫЯЛОГУ ЁСЦЬ

**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі** падчас сустрэчы са спікерам ніжняй палаты парламента Малайзіі Пандзікарам Амінам Муліа паведаміў свайму калегу, што ў Палаце прадстаўнікоў ужо сфарміравана рабочая група па ўзаемадзеянні з парламентам Малайзіі.

— Мы надаём вельмі вялікую ўвагу такім рабочым групам, паколькі яны — пляцоўка для прасоўвання нашых інтарэсаў, ідэй, прапаноў па наладжванні і пашырэнні міжпарламенцкага і міждзяржаўнага супрацоўніцтва. Мы лічым, што сёння ў нас ёсць неабходная аснова для таго, каб паглыбіць наш палітычны дыялог, развіваць гандлёва-эканамічныя адносіны, супрацоўніцтва ў галіне культуры, навукі, адукацыі, аховы здароўя. У нас ёсць велізарны нерэалізаваны патэнцыял, і на гэты конт маюцца канкрэтныя прапановы.

Па выніках сустрэчы абодва спікеры падпісалі мемарандум аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве паміж Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і Палатай прадстаўнікоў парламента Малайзіі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ТАЛЕНАВІТЫМ І ПЕРСПЕКТЫЎНЫМ

## Стыпендыі Прэзідэнта Беларусі назначаны маладым вучоным

Адпаведнае распараджэнне падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка. Стыпендыі назначаны 94 маладым вучоным, у тым ліку 5 дактарам навук ва ўзросце да 45 гадоў, 49 кандыдатам навук ва ўзросце да 35 гадоў і 40 маладым вучоным без ступені ва ўзросце да 30 гадоў. Сярод іх — прадстаўнікі фізіка-матэматычных, тэхнічных, хімічных, біялагічных, медыцынскіх, фармацэўтычных, аграрных, ветэрынарных, юрыдычных, сацыяльных і гуманітарных навук.

Навуковыя дасягненні стыпендыятаў па прыярытэтных напрамках фундаментальных і прыкладных даследаванняў знайшлі практычнае прымяненне ў дзейнасці прадпрыемстваў галін эканомікі і ўстаноў сацыяльнай сферы Беларусі.

# СУСЕДЗІ ДАВЯРАЮЦЬ

## Расіяне назвалі Беларусь найбольш паспяховай краінай СНД і галоўным партнёрам Расіі

**Пра гэта сведчаць вынікі апытання, праведзенага Усерасійскім цэнтрам вывучэння грамадскай думкі, паведамляе БЕЛТА.**

Паводле даследавання, Беларусь сярод краін — членаў СНД карыстаецца найбольшай сімпатыяй і падтрымкай расіян: самай стабільнай і паспяховай лічаць 68% апытаных. На другім месцы — Казахстан (51%). Далей — Арменія (16%), Узбекістан (14%) і Таджыкістан (7%).

Больш як 66% расіян таксама назвалі Беларусь галоўным партнёрам сваёй краіны на сусветнай арэне. Адносна Казахстана такога ж меркавання прытрымліваюцца 55% рэспандэнтаў. Далей з вялікім адрывам у рэйтынгу ідуць Арменія (16%), Узбекістан (10%), Азербайджан (8%).

Па крытэрыі забеспячэння правоў рускамоўнага насельніцтва Беларусь таксама займае першае месца — так лічаць 69% расіян. Другое месца зноў у Казахстана — 38%. Прыкметна радзей у гэтым пытанні рэспандэнты адзначаюць іншыя краіны СНД: Арменію (13%), Украіну (6%), Кыргызстан, Азербайджан, Малдову, Узбекістан (па 5%), Грузію, Таджыкістан (па 4%), Туркменістан (2%).

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўзначаліў рэйтынг даверу лідарам дзяржаў — членаў СНД: аб сваім даверы яму заявілі 65% расіян. У Нурсултана Назарбаева — 54%. Іншым кіраўнікам краін — удзельніц СНД выказваюць давер ад 2% да 11% апытаных: Ільхаму Аліеву — 11%, Сержу Саргсяну — 8%, Шаўкату Мірзіёеву — 6%, Алмазбеку Атамбаеву і Ігару Дадону — па 5%, Гурбангулы Бердымухамедаву і Эмамалі Рахмону — па 4%, Георгію Маргвелашвілі — 3%, Пятру Парашэнку — 2%.

# АСЯРОДДЗЕ, ДАСТУПНАЕ ДЛЯ ЎСІХ

**Праект Нацыянальнага плана па Канвенцыі аб правах інвалідаў будзе вынесены на грамадскае абмеркаванне.**

Такое рашэнне прынята на выязным пасяджэнні Рэспубліканскага міжведамаснага савета па праблемах інвалідаў, якое адбылося ў Жлобіне пад старшынствам намесніка прэм'ер-міністра, кіраўніка савета Наталлі Качанавай, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Прапановы па праекце Нацыянальнага плана дзеянняў былі распрацаваны Навукова-даследчым інстытутам працы. Стратэгічная мэта плана — забяспечыць прававыя, арганізацыйныя і інстытуцыянальныя ўмовы для рэалізацыі правоў інвалідаў у краіне. Гэтая работа будзе праводзіцца па некалькіх напрамках. Адзін з самых важных — забеспячэнне роўнасці і абарона ад любой дыскрымінацыі з боку як дзяржаўных, так і прыватных структур. Асаблівая ўвага нададзена пашырэнню даступнасці асяроддзя для роўнага ўдзелу інвалідаў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.

Сярод іншых напрамкаў — арганізацыя эфектыўнай медыцынскай дапамогі і рэабілітацыі; забеспячэнне дзяржаўнай падтрымкі і сацыяльнай абароны; забеспячэнне і развіццё ўмоў для рэалізацыі інвалідамі права на працу; правядзенне асветніцка-выхаваўчай работы ў грамадстве па пытаннях інваліднасці і ўмацаванні павагі правоў і годнасці інвалідаў; забеспячэнне рэалізацыі правоў інвалідаў на ўдзел у грамадскім і палітычным жыцці краіны; забеспячэнне інклюзіўнай адукацыі на ўсіх узроўнях і навучанне па працягу ўсяго жыцця; пашырэнне ўдзелу інвалідаў у культурным і спартыўным жыцці краіны.

Нацыянальны план стане стратэгічным дакументам, які будзе аб'ядноўваць і каардынаваць намаганні дзяржаўных органаў і арганізацый, а таксама інстытутаў грамадзянскай супольнасці па рэалізацыі палажэнняў Канвенцыі аб правах інвалідаў.

На пасяджэнні міжведамаснага савета прынята рашэнне аб тым, што ў першым паўгоддзі аблвыканкамы і Мінгарвыканкам правядуць рабочыя семінары з удзелам зацікаўленых службаў, наймальнікаў, грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў па пытаннях занятасці інвалідаў. Будуць выпрацаваны канкрэтныя меры па працаўладкаванні інвалідаў і развіцці дзейнасці прадпрыемстваў, якія выкарыстоўваюць працу людзей з абмежаванымі магчымасцямі, а таксама па працаўладкаванні выпускнікоў устаноў адукацыі. Будуць разгледжаны і пытанні ўдасканалення заканадаўства ў сферы працаўладкавання інвалідаў з улікам нормаў Канвенцыі.

# «Вечная» камуналка...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як заўсёды, прысутнічалі пытанні па газіфікацыі. Былі званкі ад людзей, якія не па сваёй віне трапілі ў складаныя жыццёвыя сітуацыі. У такім вось становішчы знаходзіцца настаўніца са Столінскага раёна, у якой цяжка хварэе 18-гадовы сын. Зарплата 41-гадовай маці і пенсія па інваліднасці сына не даюць магчымасць купляць дарагое імпартнае лякарства, а яно вельмі патрэбнае. У гэтым выпадку абласное ўпраўленне аховы здароўя абавязалася правесці неабходныя кансіліумы, каб прызначыць названы прэпарат афіцыйна і забяспечыць ім сям'ю бясплатна.

Не абыходзіцца апошнім часам і без зваротаў наконт закрыцця сельскіх магазінаў. Жанчына з вёскі Завершша Кобрынскага раёна наракала на гандлёвае абслугоўванне аўтакрамы. Машына прыходзіць перад абедам, а многія вяскоўцы працуюць, яны не паспяваюць атаварыцца. У вёсцы без магазіна жыццё наогул становіцца на парадак горшым. У ходзе абмеркавання гэтага пытання ўзнікла тэма развіцця прыватнага гандлю. Сталыя людзі ўспамінаюць, як раней працавалі «крамы на даму». Можа, да нечага падобнага давядзецца вярнуцца.

### Адказныя асобы не павінны «тушыць пажар»

**Мікалай ШАРСТНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама,** не раз падкрэсліваў, што пераважная большасць праблемных тэм, якія агучваюцца падчас «прамых ліній», знаходзяцца ў кампетэнцыі мясцовай улады. Чыноўнікам неабходна своечасова вызначаць патэнцыйныя праблемы, а не быць «пажарнымі-выратавальнікамі». Дарэчы, на Віцебшчыне сёлета на абласны ўзровень улады паступіла прыблізна на 25% меней зваротаў, чым летась.

У мінулую суботу губернатару патэлефанавалі каля 30 грамадзян. І зноў у асноўным турбавалі жыхары буйных населеных пунктаў. У тым ліку каля паловы — з Віцебска. Гараджане скардзіліся на «вечныя» камунальныя праблемы: дах, «басейн» з каналізацыйнымі сцёкамі ў падвале... Тлумачэнні даваў старшыня Віцебскага гарвыканкама. Ён, як і іншыя кіраўнікі гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, «дзяжурыў анлайн» — у кабінеце па месцы працы.

Жыхароў Віцебска цікавілі і перспектывы забудовы. Напрыклад, чаму каля адной са школ у спальным мікрараёне доўгі час нічога не будуецца? Там з часам узвядуць аб'екты сацыяльнага прызначэння, у тым ліку і сістэмы адукацыі — быў адказ. Але, улічваючы няпросты ў эканамічным плане час, на думку губернатара, спачатку трэба завяршыць будаўніцтва аб'ектаў, якія ўжо ўзводзяцца. Будаўнікам трэба ў першую чаргу працаваць там, дзе ў гэтым ёсць асаблівая патрэба. У прыватнасці, вялікі недахоп у садках і школах у некалькіх мікрараёнах на ўскраіне, якія вядомыя пад агульнай назвай «Білева». У мікрараёне «Поўдзень-7» даўно ўжо планавалі ўзвесці паліклініку. У бюджэце пастараюцца знайсці сродкі і для будаўніцтва іншых медыцынскіх аб'ектаў.

Былі і нестандартныя званкі. У прыватнасці, жыхар Дубровенскага раёна параўноўвае наконт таго, што трэба зрабіць для паляпшэння жыцця ў рэгіёне.

А жанчына з Талачынскага раёна турбуецца, што ААТ «Талачынскі элеватар» увайшло ў інтэграцыйную структуру на базе Аршанскага камбіната хлебапрадуктаў. Ці не будзе горш наконт зарплаты і іншага? Губернатар супакоіў і пераканаў, што такая інтэграцыя толькі на карысць работнікам і спажыўцам гатовай прадукцыі.

Як заўсёды, падчас «прамых ліній» адразу ж даваліся даручэнні разбірацца ў агучаных сітуацыях. Некаторыя звароты, як паказвае практыка, не патрабуюць вялікіх фінансавых выдаткаў. Кіраўнік аблвыканкама потым дакладваюць, як вырашана канкрэтная праблема. Ён нават тэлефануе заяўнікам, каб высветліць, ці задаволены яны дзеяннямі адказных асоб, якія павінны былі прыняць меры.

### Неадкладнае рэагаванне — лепшы падарунак

На суботнюю прамую лінію **старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзіміра ДВОРНІКА** паступіла 32 званкі. Людзі тэлефанавалі з усіх раёнаў вобласці па самых розных пытаннях. Дарэчы, шэсць зваротаў было з падзякай — за хуткае рашэнне былой праблемы.

Напрыклад, гамяльчанка выказала ўдзячнасць за дапамогу ў аднаўленні дакументаў. А вось Эмілія Афанасьева з Мазыра расказала пра імгненную рэакцыю адпаведных службаў — на просьбу аб капітальным рамонце дома па вуліцы Якуба Коласа:

— У вас рэпутацыя чалавека высокай кампетэнцыі, які здольны вырашаць спрэчныя пытанні грамадзян, — адзначыла мазыранка.

Размова з жыхарамі вобласці ішла як пра асабістыя праблемы, так і пра перспектывы развіцця рэгіёна. Уладзімір Дворнік падкрэсліў, што ўзнімаліся праблемы, вырашэнне якіх увесь час абмяркоўваецца мясцовымі ўладамі:

— У працы з людзьмі ў першую чаргу неабходна прытрымлівацца прынцыпаў аб'ектыўнасці і справядлівасці. Выконваючы гэта правіла, органы мясцовай улады заўсёды змогуць растлумачыць грамадзянам, чаму было прынята тое ці іншае рашэнне.

Напрыклад, новаўвядзенне, якое тычыцца чарговасці капітальнага рамонту шматпавярховых дамоў. У райвыканкамах па гэтай тэме цяпер у адкрытым доступе тры дакументы: спіс усіх жылых дамоў з указаннем года пабудовы, спіс чарговасці іх рамонту ў строгай адпаведнасці з годам пабудовы і пералік дамоў, якія будуць рамантавацца сёлета.

— Справядліва было б, каб усе дамы рамантаваліся строга па "ўзроставым ранжыры", — адзначыў кіраўнік Гомельшчыны. — Аднак здараецца, што «маладзейшыя» дамы становяцца аварыйнымі. Тады ствараецца спецыяльная камісія, і гэты дом па аб'ектыўных прычынах рамантуецца ў першую чаргу. Пры такой сістэме працэс становіцца цалкам празрыстым і зразумелым усім. Увогуле падчас «прамой лініі» мы абмяркоўвалі тыя ж тэмы, якія ўвесь час прысутнічаюць на нарадах прадстаўнікоў органаў улады.

Падчас гутаркі з жыхарамі вобласці прагучала просьба гамяльчанкі Вольгі Чарнабаевай, якая выхоўвае траіх дзяцей. Жанчына расказала, што яе старэйшы сын марыць трапіць на губернатарскую ёлку ў цырку. У выніку запрашэнне прынялі ўдзел у навагоднім свяце атрымала ўся сям'я. Разам з 12-гадовым Уладзіславам Дзеда Мароза з падарункамі сустрэнуць і малодшыя дзеці — Ліза і Саша.

Усе звароты, якія паступілі на прамую лінію старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзіміра Дворніка, узяты на кантроль.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*
**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*
**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Давайце падтрымаем!

# ДЗЕЦІ ДРЭННА БАЧАЦЬ, А БАЦЬКІ... НЕ ЗАЎВАЖАЮЦЬ

### Маштабная ініцыятыва па праверцы зроку ў дзяцей сельскай мясцовасці паспяхова працягваецца

**Сродкі на рэалізацыю праекта «Я бачу!» будуць сабраныя падчас чарговай дабрачыннай ініцыятывы кампаніі velcom «Рабіць добра так проста», якая працягнецца з 19 па 31 снежня. З кожнага прададзенага смартфона або планшэта velcom пералічыць 5 рублёў Беларускаму дзіцячаму фонду для арганізацыі работы мабільнай брыгады афтальмолагаў. На кошце прылад гэта ніяк не адаб'ецца — мабільны аператар будзе ажыццяўляць узносы са свайго прыбытку. На працягу наступнага года ўрачы будуць абследаваць дзяцей у сельскіх раёнах Гомельскай вобласці.**

«Я бачу!» закліканы зрабіць афтальмалагічную дапамогу больш даступнай для сельскіх школьнікаў. Праект з задавальненнем падтрымаў 11-разовы параалімпійскі чэмпіён Ігар Бокій, які выступае сярод атлетаў з парушэннямі зроку. Гомельская вобласць стане другім рэгіёнам, у якім афтальмолагі агледзяць сельскіх дзяцей. Сёлета ўрачы абследавалі звыш 10 тысяч вясковых дзяцей на Магілёўшчыне. Вынікі аказаліся трывожнымі: дрэнна бачаць кожны чацвёрты, прычым маштаб праблемы залежыць ад раёна — калі ў адным зрок зніжаны дзесьці ў 15 працэнтаў абследаваных, то ў другім — ажно ў палове.

Унесці свой уклад у павышэнне якасці афтальмалагічнай дапамогі дзецям, стаць удзельнікам дабрачыннай акцыі можа кожны. Сабраныя сродкі павінны пакрыць расходы, звязаныя з работай выязной брыгады дзіцячых афтальмолагаў. Для гэтага патрабуецца аўтобус са спецыяльным абсталяваннем, у тым ліку рэфрактометрам.

Праект ужо даказаў сваю значнасць. Відавочна, што ў сельскай мясцовасці далёка не ў кожнай сям'і ёсць магчымасць паказаць дзіця афтальмолагу двойчы ў год, як належыць. Бацькі, між тым, нават не заўважаюць, што ў дзіцяці зніжаецца зрок, або па нейкіх прычынах не могуць адвезці яго на агляд у раённы ці абласны цэнтр, што можа прывесці да незваротных наступстваў. Вось і Ігар Бокій кажа, што на сваім вопыце пераканаўся, наколькі важная своечасовая медыдапамога: «Своечасовы паход да ўрача, напэўна, паправіў бы мае праблемы са зрокам».

— Мабільная брыгада аглядае дзяцей не выбарачна, а ўсіх адразу — у школах або грамадскіх месцах, — тлумачыць **дырэктар Беларускага дзіцячага фонду Аляксандр ТРУХАН.** — Хацелася б ахапіць наогул усіх сельскіх дзяцей па краіне, што цалкам магчыма пры пэўнай падтрымцы.

Дзякуючы новай ініцыятыве БДФ мабільная брыгада збірае статыстычную інфармацыю, якая можа выкарыстоўвацца для больш эфектыўнай прафілактыкі захворванняў зроку ў дзяцей. Тыя, у каго былі выяўлены праблемы, адпраўляліся ўрачамі мабільнай брыгады на лячэнне або паглыбленую дыягностыку ў медустановы.

Палова дзяцей са зніжанай вастрынёй зроку мае патрэбу ў акулярах, якія ім і былі выпісаны, паведаміла каардынатар праекта «Я бачу!», **урач-афтальмолаг Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы Марыя МАЛАШКА.** 38 дзяцей атрымалі хірургічную дапамогу ў межах абласной бальніцы. Галоўным чынам, па прычыне касавокасці і блізарукасці высокай ступені.

Напрыканцы 2015 года ў каляндарнай акцыі «Рабіць дабро так проста» ўзялі ўдзел каля 36 тысяч чалавек. На сабраныя ў выніку звыш 1,8 млрд рублёў удалося рэалізаваць першы этап праекта «Я бачу!».

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

■ З нагоды

# ІМ ДАВЕРАНА МІРНАЕ НЕБА

### Баявы сцяг быў уручаны камандаванню ВПС і войскаў СПА

**На вуліцы Якуба Коласа ў Мінску з'явілася адметная кампазіцыя. На тэрыторыі камандавання Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны былі ўсталяваны макеты асноўных узораў узбраення радыётэхнічных войскаў, зенітна-ракетных войскаў і авіяцыі. Яны сімвалізуюць адзінства гэтых родаў войскаў у забеспячэнні мірнага неба над Беларуссю. На чале кампазіцыі — легендарны савецкі знішчальнік МіГ-29.**





Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Бартавы нумар самалёта — 15. І гэта сімвалічна, бо 21 снежня камандаванне ВПС і войскаў СПА адзначае пятнаццацігадовы юбілей. А напярэдадні гэтай даты **міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ** уручыў яму баявы сцяг.

— Гэта сімвал доблесці і гонару, сведчанне таго, што абаронцы нашай краіны свой доўг выканалі, — гаворыць Андрэй Раўкоў. — За гэты час Ваенна-паветраныя сілы і войскі супрацьпаветранай абароны прайшлі вялікі шлях няспыннага развіцця. Увага да пытанняў іх мадэрнізацыі і пераўзбраення знаходзіцца ў нас на дзяржаўным узроўні. Летась і сёлета былі закуплены па чатыры вучэбна-баявыя самалёты Як-130, якія выканалі практычна ўвесь спектр магчымых задач. Да таго ж закуплена першая партыя з шасці верталётаў Мі-8МТВ-5. У маі наступнага года будзе завершана выкананне гэтага кантракта з расійскімі вытворцамі. Такім чынам, мы атрымаем паўнавартасную новую лётную эскадрыллю, здольную вырашаць вельмі сур'ёзныя задачы па абароне краіны. Што да зенітных ракетных войскаў, то ўжо пастаўлены на баявое дзяжурства комплексы С-300, якія былі атрыманы з Расіі і адрамантаваны за ўласныя сродкі. Таксама закуплена чацвёртая батарэя ЗРК «Тор-М2».

Напрыканцы ўрачыстай цырымоніі Андрэй Раўкоў і камандуючы ВПС і войскамі СПА генерал-маёр Алег Двігалёў адкрылі памятную дошку на пастаменце памятнага знака. На ёй выбіты надпіс «Народ Беларусі даверыў нам мірнае неба!».

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Цяпло з Атлантыкі

### Сіноптыкі прагназуюць тыдзень туманаў, калі сярэдняя тэмпература паветра будзе на 3—5 градусаў вышэйшая за норму

**На гэтым тыдні нас чакае сырое і амаль лістападаўскае надвор'е, бо на тэрыторыю краіны будзе паступаць цёплая і вільготная паветраная маса з Атлантыкі, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ. Спецыяліст папярэджвае, што чакаецца шмат туманаў, таму аўтаўладальнікам варта быць вельмі асцярожнымі.**



А сёння ў асобных раёнах магчымы невялікі дождж і мокры снег. Паўсюдна чакаецца туман, месцамі слабы галалёд, а на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра складзе ад нуля да плюс 3 градусаў. Мяккім будзе надвор'е і ў сераду, калі чакаецца пераважна без ападкаў, толькі ўначы па паўночным усходзе краіны магчымы невялікія ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах краіны туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра нават уначы складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, аднак пры праясненнях — да мінус 6. Удзень будзе ад мінус 2 да плюс 3 градусаў. Не чакаецца ападкаў і ў чацвер. Ізноў месцамі магчымы туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература ўначы будзе ад нуля да мінус 6 градусаў, удзень — ад 2 марозу да 3 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, не будзе ападкаў у пятніцу і суботу. У асобных раёнах у гэтыя дні чакаецца туман, слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Уначы прагназуецца ад нуля да мінус 7 градусаў, удзень — ад мінус 2 да плюс 3. Чарговы актыўны атмасферны фронт завітае да нас у нядзелю, таму паўсюдна пройдуць кароткачасовы мокры снег і дождж. У асобных раёнах чакаецца слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Уначы чакаецца невялікі мароз, а ўдзень прыкладна каля нуля.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Новая пляцоўка

# На «Кафедры» ёсць вакансіі!

**На нацыянальным адукацыйным партале adu.by запрацаваў (пакуль што ў тэставым рэжыме) інтэрнэт-рэсурс пад амбіцыйным загалоўкам «Кафедра (навука online)».**

Сур'ёзная назва — сур'ёзныя справы: новы сецівы праект скіраваны на развіццё інавацыйных форм міжнароднага навуковага ўзаемадзеяння, актывізацыю дыялогаў паміж навукоўцамі самых розных, нават вельмі далёкіх адна ад адной краін, стварэнне магчымасцей для аператыўнага (нягледзячы на адлегласці) абмеркавання актуальных даследаванняў і абмену вопытам. Ці можа гэта азначаць, што ў хуткім часе не патрэбны будуць навукоўцам камандзіроўкі і візы? Верагодна, што так. Амбіцыйна? Больш чым!

Новая інтэрнэт-пляцоўка заклікае да інтэрактыўнай экспертнай камунікацыі па шырокім коле даследчых праблем. Гэта, безумоўна, патрэбна ў першую чаргу самім навукоўцам, але хіба не можа быць цікава і старанаму студэнту, які рыхтуецца да семінара, і журналісту, якому заўтра браць інтэрв'ю ў прафесара, і якому-небудзь інтэрнэт-сёрферу, чый мозг сілкуецца інфармацыяй вышэйшага гатунку? Адкрыўшы «Кафедру», ужо сёння можна, напрыклад, пазнаёміцца з ідэяй стварэння асобасна-арыентаванага падручніка па геаграфіі (ад украінскага даследчыка) або з аднойлекай канцэпцыяй беспрапыннага выхавання дзяцей і моладзі (беларуская аўтарства). На рэсурсе адкрыты раздзелы «Навуковыя мерапрыемствы», «Навуковыя даследаванні», «Задаць пытанне аўтару», «Інтэрактыўная сесія», «Кансультацыя online»... Што трэба, каб рэсурс пераключыўся ў рэжым рэальнага дзеяння? Артыкулы навукоўцаў, прадастаўленыя калегам для абмеркавання, ініцыятыўныя выступленні, ідэі і прапановы, гатоўнасць адказваць на пытанні і задаваць іх... «Кафедра (навука online)» — ёсць, патрабуюцца навукоўцы.

**Святлана ВОЦІНАВА**

# За выхадныя дні на пажарах загінулі 12 чалавек

**Па аператыўных звестках Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, за суботу-нядзелю загінулі 12 чалавек, яшчэ сем былі выратаваны ад гібелі ў агні.**

Так, у нядзелю ў палове дзявятай раніцы пажар здарыўся ў кватэры на першым паверсе чатырохпавярховага жылога дома ў Мазыры. Падчас здарэння загінулі гаспадыня, 1954 года нараджэння, і яе сваяк, 1938 года нараджэння, які быў у гасцях. Абодва пенсіянеры. Работнікамі МНС выратаваны яшчэ адзін мужчына, што жыў тут жа. Ён атрымаў апёкі першай-другой ступені да 50 працэнтаў паверхні цела. Акрамя таго, з кватэры на трэцім паверсе выратавалі пенсіянера, які атруціўся прадуктамі гарэння. Яго ратавальнікі знайшлі на падлозе ў калідоры. Абодва пацярпелыя былі шпіталізаваны ў бальніцу. Адна з версій прычыны пажару — неасцярожнасць пры курэнні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

# ПАДАРАЖЭЎ ПРАЕЗД АЎТОБУСАМІ Ў МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Тарыфы на гарадскія і прыгарадныя перавозкі пасажыраў аўтамабільным транспартам павялічаны ў Мінскай вобласці.**

Адпаведныя рашэнні Мінаблвыканкама ад 14 снежня апублікаваныя на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале. Новыя тарыфы пачнуць дзейнічаць з 17 снежня.

Так, кошт праезду на звычайных і хуткасных маршрутах у рэгулярных зносінах складзе 45 капеек за адну паездку, на экспрэсных — 55 капеек. Кошт правозу ручной паклажы таксама павялічыцца да 45 капеек. Зацверджаны і новыя памеры тарыфаў на праезд у прыгарадным аўтамабільным транспарце: кошт аднаго кіламетра на звычайных маршрутах складзе 0,06 рубля, на хуткасных маршрутах — 0,08 рубля, на дадатковых рэйсах — 0,08 рубля, на экспрэсных маршрутах — 0,09 рубля.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ДОМ ЛЯ ДАРОГІ




**Дом-музей быў створаны да 100-годдзя пісьменніка.**

## НЕ ХАПАЕ ПРАДПРЫМАЛЬНІКА

Літаратурны музей ужо 6 гадоў як з'яўляецца філіялам раённага гісторыка-археалагічнага. Ад горада да вёскі Малая Багацькаўка, дзе ён знаходзіцца, — 26 кіламетраў, і мы разам з дырэктарам музея Людмілай Кірыенкай едзем на месца. Траса Мсціслаў-Горкі мясцовага значэння. Зварочваем убок ад асноўнай дарогі, яшчэ амаль кіламетр шляху — і вось яна, малая радзіма братоў Гарэцкіх. Пры ўездзе ў вёску ў вочы адразу ж кідаецца вялікая драўляная хата з памятнай дошкай на сцяне. Вакол — ні душы, нават аўтакрама насупраць будынка стаіць у адзіноце. Кіроўца сумуе ў кабіне, кажа, што прыходзілі некалькі жыхароў, але яны ўжо купілі ўсё, што ім трэба, і пайшлі.



**Інсталяцыя музея паўтарае абстаноўку вясковага пакоя пачатку XX стагоддзя.**

Музей абслугоўваецца па заяўцы, загадчыца трэці месяц як хварэе. За шклом на акне вісіць аб'ява з нумарам тэлефона мсціслаўскага музея. Па ім можна дамаўляцца наконт экскурсій. Калі знаходзіцца жадаючая, экскурсавод едзе з горада. Але, як сведчыць Людміла Сяргееўна, за апошнія тры месяцы журналіст «Звязды» — другая наведвальніца пасля той мінчанкі, якая ў верасні тут пабывала, а потым напісала зварот.

> **«Які ж гэта будзе музей Гарэцкага, калі ён нарадзіўся ў вёсцы? Там яго асяроддзе».**

У доме холадна, пахне сырасцю і адзінотай. Калідор дзеліць хату на 2 пакоі. У адным — драўляныя стэнды з фотаздымкамі сям'і Гарэцкіх, копіі дакументаў, кнігі Максіма Гарэцкага. У цэнтры хаты — вялікі партрэт пісьменніка. Пад ім мяшочак з зямлёй з месца расстрэлу. На фота — памятны знак у горадзе Вязьма Смаленскай вобласці, месцы мяркуемага расстрэлу Максіма Гарэцкага.

Другая палова дома дэманструе быт звычайнай сялянскай сям'і канца XIX — пачатку XX стагоддзя — ручнікі, калыска, падвешаная пад столлю, руская печка, палаці. Ёсць нават некалькі балалаек і патэфон. Гэта рэчы эпохі і да Гарэцкіх маюць апасродкаваныя адносіны. «З арыгінальных рэчаў, якія належалі б сям'і Гарэцкіх, нічога няма. Гэта ўсё, што перадаў нам музей гісторыі беларускай літаратуры», — кажа Людміла Кірыенка.

Акрамя музея, іншых сацыяльных аб'ектаў у Малой Багацькаўцы няма. У вёсцы наогул засталося ўсяго некалькі хат. «А калісьці ў нас быў клуб і нават школа», — успамінае лепшыя часы **тутэйшая жыхарка Галіна ЯНЕНКА**. У маладосці ў яе была магчымасць застацца ў Маскве, нават на прыём да Брэжнева па асабістым пытанні прыязджала. Ён тады яшчэ міністрам па сельскай гаспадарцы працаваў. Але сталічная экзотыка ніколі яе не прываблівала. Іншая справа — Багацькаўка. «Тады ў нас весела было, — усміхаецца яна. — У вёсцы 40 хат стаяла, не меней. І ў кожнай па чацвёра-пяцёра дзяцей. Бывала, выйдзеш на вуліцу — вёска гудзіць. Людзі тады жылі зладжана, дружна. Гэта зараз нейкімі ваўкамі сталі».

Дом пенсіянеркі знаходзіцца па суседстве з музеем, але пра Гарэцкіх яна ведае толькі па расказах.

— Мы ж пасля вайны толькі сюды прыехалі. У тым доме, дзе цяпер музей, апошнім часам жылі старыя Федасенкі. А потым хату знеслі. Замест яе музей пабудавалі. У 90-я гады да нас госці з Мінска завіталі, дарогу вось зрабілі. Раней было не дабрацца. Наведвальнікаў музея бывае не шмат, але ж школьнікі з бліжэйшых вёсак не забываюць. Зараз, праўда, радзей сталі прыязджаць. Вёска таксама вымірае, моладзь не застаецца, адны старыя, — расказвае жыхарка Багацькаўкі.

Вось і дзеці Галіны Яненкі падаліся ў горад, унукі таксама не думаюць вяртацца. Наконт пераносу музея жанчына не супраць, але ж не хавае, што будзе яшчэ больш сумна. Так хоць нейкае жыццё адчуваецца.

Калі ехалі назад у Мсціслаў, сэрца таксама шчаміла. Вёска пустая, але не сказаць, што закінутая. Ды і хаты на выгляд яшчэ добрыя. Стаяць, нібы хутаркі, на адлегласці адна ад адной. Вакол лес, прастора — прыгожа так, што дух захоплівае. Вось толькі сапраўднага бізнесмена на ўсё гэта не хапае. Ён бы і музей узяў пад сваё крыло. Вёска знаходзіцца паміж Мсціславам і Горкамі, дык няўжо няма ніводнага прадпрымальнага чалавека, які б захацеў тут сваю справу пачаць? Сёння ўладальнікі аграсядзіб толькі і чапляюцца за нейкія адметнасці і славутасці, каб прывабіць турыстаў. А тут такое прыгожае месца застаецца незапатрабаваным.

## ЗАХАВАЦЬ ПАМЯЦЬ

Выпрабаванні ў лёсе музея пачаліся не ўчора. Спачатку ён змяніў гаспадара. Да 2009 года гэты дом быў рэспубліканскай маёмасцю. Як патлумачыла **намеснік дырэктара музея гісторыі беларускай літаратуры Анастасія КАЛЬЦОВА**, цяжка абслугоўваць будынак на такой адлегласці. Пачуць пра яго магчымы пераезд з Багацькаўкі ў Мсціслаў для яе было нечаканасцю.

— Пытанне неадназначнае, — разгубілася яна. — Калі парушаецца аўтэнтыка — гэта дрэнна, бо парушаецца сама канцэпцыя музея. Максім Гарэцкі нарадзіўся менавіта ў Багацькаўцы, а не ў Мсціславе. На жаль, праблема з утрыманнем такіх музеяў існуе. Той жа Літаратурны музей Петруся Броўкі, які з'яўляецца нашым філіялам, знаходзіцца за 250 кіламетраў ад Мінска, на хутары. Народу туды дабрацца цяжка, бо дарога дрэнная. Улічваючы, што цяпер з грашыма напружанне, трэба правільна арганізаваць лагістыку. Каб акупіць праезд, трэба рабіць дарагія білеты. Гэта таксама непапулярная мера. Наогул, калі музеі паміраюць, баліць душа.

Музей у Багацькаўцы быў пабудаваны да 100-годдзя Максіма Гарэцкага. **Радзім ГАРЭЦКІ, сын брата Максіма Гарэцкага — Гаўрылы**, узгадвае, як усё было:

— Гэтаму спрыяў Аляксандр Кузьмін, сакратар ЦК Кампартыі Беларусі па ідэалогіі, які казаў, што трэба аднавіць хату, дзе нарадзіўся Максім Гарэцкі. Мой бацька тады яшчэ быў жывы і падказваў, дзе што знаходзілася. Потым было ўрачыстае адкрыццё. У ім прымаў удзел і Ніл Гілевіч. Прыйшло шмат жыхароў. Яшчэ былі жывыя людзі, якія ведалі братоў Гарэцкіх. Бацька перадаў свае асабістыя рэчы ў гэты музей. А я знайшоў у архівах інфармацыю, як на самай справе загінуў Максім. Існавала версія, што ён памёр ад кровазліцця ў мозг у 1939 годзе. На самай справе — яго расстралялі ў 1938-м.

Прапанову перавезці музей у Мсціслаў нашчадак успрыняў балюча. «Мне хацелася б даведацца, як усё ж такі гэта будзе, — хвалюецца ён. — На душы дагэтуль непрыемны асадак ад таго, што знеслі дом у Горках, дзе жыў Максім Гарэцкі. Там бывалі такія знакамітыя людзі XX стагоддзя, як Юрка Гаўрук, Якуб Колас, Паўліна Мядзёлка. На будынку мелася памятная дошка, што там жыў Максім Гарэцкі. Але дом знеслі, і нічога не засталося. Абяцалі паставіць памятны знак, аднак яго дагэтуль няма. Тут таксама не ведаю, што атрымаецца. Ды і як гэта наогул успрымаць? Які ж гэта будзе музей Гарэцкага, калі ён нарадзіўся ў вёсцы? Там яго асяроддзе. Уяўляеце, што было б, калі б музей з Міхайлаўскага перанеслі ў Пскоў?

## БУДЗЕ БОЛЬШ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ

Нельга сказаць, што музей у Малой Багацькаўцы не наведваюць. У кнізе водгукаў, якая там знаходзіцца, шмат захопленых запісаў. І даты зусім свежыя — 2013, 2014, 2015 і нават 2016 год. «Дзякуй добрым людзям за захаванне памяці пра славуты род Гарэцкіх», — напісаў беларускі пісьменнік Анатоль Бутэвіч. «Очень довольны посещением. Всегда интересно узнать историю о знаменитых



**У кнізе водгукаў — шмат падзяк.**

белорусских писателях», — пакінулі водгук у 2013 годзе наведвальнікі з расійскага горада Іванава. «Посмотрели, ознакомились — все классно», — зрабілі летась запіс некалькі сем'яў з Масквы. Сваімі ўражаннямі дзеляцца госці з Санкт-Пецярбурга, Мінска, Гомельскай вобласці...

Дырэктар музея Людміла Кірыенка лічыць, што калі б музей прапісаўся ў Мсціславе, такіх запісаў было б куды больш.

— Можна было б праводзіць болей адкрытых урокаў для школьнікаў, ды і колькасць наведвальнікаў павялічылася б, — кажа яна. — Тым больш, што ў біяграфіі Максіма Гарэцкага ёсць перыяд, звязаны з Мсціславам, калі ён у будынку мужчынскай гімназіі разам з Якубам Коласам вёў курсы павышэння кваліфікацыі для настаўнікаў.

Зразумець яе можна. Зараз, калі загадчыца філіяла на бальнічным, цяжка адсочваць лёс музея на адлегласці. Калі з грашыма было б лягчэй, такога б пытання і не ўзнікла. А тут сродкаў нават на экспанаты не хапае. Будынку патрэбны рамонт. Як запэўніваюць у раёне, папярэднімі гаспадарамі ён не праводзіўся.

Дарэчы, нават назва Малая Багацькаўка ўжо даўно трансфармавалася ў проста Багацькаўку. У Падсолтаўскім сельсавеце паведамілі, што яе аб'ядналі з суседняй Вялікай Багацькаўкай і зараз на 2 гэтыя вёскі налічваецца 15 дамоў, дзе жыве 25 чалавек, у асноўным — пенсіянеры. Цэнтр жыцця знаходзіцца ў пасёлку Курманава, ад якога да Багацькаўкі 2 кіламетры. Загадчыца філіяла, дарэчы, там і жыве. Апошнім часам колькасць жыхароў толькі змяншаецца, моладзь едзе ў Мсціслаў і далей. Сёлета закрылі Несцераўскую школу, дзяцей зусім не засталося...

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*zigulya@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### Каментарый у тэму

**Старшыня Мсціслаўскага райвыканкама Васіль ВІЦЮНОЎ:**

— Калі музей перавезці ў Мсціслаў, будзе больш карысці і рацыянальней будуць выкарыстоўвацца бюджэтныя сродкі на яго ўтрыманне і захаванне. Багацькаўка — бесперспектыўная вёска, хутка там зусім не застанецца жыхароў. Не кожны яшчэ пагодзіцца ехаць за 25 кіламетраў, каб наведаць гэты музей. Ды і ахова, і само напаўненне музея былі б больш грунтоўнымі, калі б ён знаходзіўся ў горадзе. Раённаму музею, на балансе якога знаходзіцца філіял, таксама было б прасцей. Штат у яго невялікі, рук на ўсё не хапае. Ну а месца, дзе зараз знаходзіцца музей і якое з'яўляецца радзімай Максіма Гарэцкага, павінна быць адзначана памятным знакам. Яго выгляд і форму таксама трэба абмяркоўваць. Але ўсё будзе залежыць, як вырашыць насельніцтва раёна і краіны, у тым ліку Міністэрства культуры. На падставе гэтых меркаванняў і будзе прымацца рашэнне.




■ Фестывалім!

# «АТМАСФЕРА КУЛЬТУРЫ І МУЗЫКІ»

## Чым здзівіць Бабруйск у наступным годзе?

**Статус культурнай сталіцы гэтымі днямі быў перададзены ад Маладзечна Бабруйску. На ўрачыстым канцэрце, які праходзіў у Палацы культуры ў Маладзечне, прысутнічалі шматлікія ганаровыя госці — міністр культуры Барыс Святлоў, кампазітары Ігар Лучанок, Эдуард Зарыцкі, Алег Елісеенкаў, фотамастак Юрый Іванocc, многія сталічныя выканаўцы.**

— Асаблівая атмасфера культуры і музыкі, творчага натхнення заўсёды панавала ў нашым горадзе, — адзначыў **старшыня Маладзечанскага райвыканкама Аляксандр ЯХНАВЕЦ**. — Гэты год быў асабліва яркім, запамінальным, незабыўным. Ён прайшоў надзвычай арганізавана — вялікі дзякуй усім: работнікам сферы культуры, а таксама тым, хто ствараў утульнасць, інфармаваў насельніцтва, клапаціўся пра бяспеку. Мы з павагай перадаём эстафету культурнай сталіцы цудоўнаму гораду Бабруйску. Нас звязваюць з ім даўнія, старажытныя падзеі. У 1811 годзе па просьбе князя Агінскага павятовае вучылішча было пераведзена з Бабруйска ў Маладзечна. Гэта дало штуршок да далейшага культурнага развіцця нашага горада. Упэўнены, што статус культурнай сталіцы яны будуць трымаць годна.

2017-ты год для бабруйчан — юбілейны — гораду спаўняецца 630 гадоў. У Бабруйску штогод праходзіць каля 2000 розных мерапрыемстваў. Візітная картка — фестываль народнай творчасці «Вянок сяброўства», фестываль керамікі «Артжыжаль», рэспубліканскі фестываль драматургіі. Штогод Бабруйск наведваюць прадстаўнікі пяці кантынентаў, 40 краін. Трэба чакаць, што ў 2017-м туды завітае яшчэ больш гасцей.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

*nina@zviazda.by*

*Маладзечанскі раён.*



**Салісты Вялікага тэатра оперы і балета на канцэрце ў Маладзечне.**

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

№ 22 (60) Вторник 20 декабря 2016 года Для читателей Беларуси, России, Казахстана, Армении, Кыргызстана

Выходит 2 раза в месяц Издается с 26 апреля 2014 года

# Когда сотрудничество перспективно и с Западом, и с Востоком



Вышивальщица Людмила Высоцкая занята на вышивании надписей на форменной одежде.

Фото БЕЛТА.

Одно из ведущих предприятий региона — Мозырская швейная фабрика «Надэкс» — активно ищет новых партнеров и в Европе, и в Азии. Компания является разработчиком и производителем мужских сорочек на протяжении 70 лет. Предприятие особенно заинтересовано в расширении своих рынков сбыта и в привлечении новых дилеров на территории ЕАЭС. В частности, «Надэкс» ищет партнеров в России и в Казахстане.

В то же время именно эта фабрика уже около двух десятков лет выполняет заказы по пошиву форменной одежды для полицейских Баварии (Германия). Если в начале сотрудничества использовались давальческое (то, которое предоставил заказчик) сырье, фурнитура и лекала, то сейчас элементы дизайна и лекала на фабрике разрабатывают самостоятельно. За последние годы также расширился и ассортимент: в его перечень вошли сорочки для сотрудников службы юстиции Баварии.

**Роман ОЛЕХНОВИЧ.**

## НОВОСТИ СОЮЗА

### ПОДХОДЫ УЖЕ ОПРЕДЕЛИЛИ

**Механизм прослеживаемости товаров планируется внедрить в Евразийском экономическом союзе к 1 февраля 2018 года.**

Эмитент обязуется приобрести Облигации до даты начала их погашения с возможностью их последующего обращения (далее – досрочный выкуп Облигаций) по текущей стоимости Облигаций 20.06.2017 у любого их владельца. Досрочный выкуп Облигаций осуществляется Эмитентом на организованном рынке в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в соответствии с законодательством Республики Беларусь и нормативно-правовыми актами Биржи. Расчеты производятся в соответствии с регламентом расчетов Биржи.

**18. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии облигаций**

С Проспектом эмиссии Облигаций можно ознакомиться в период открытой продажи Облигаций по адресу: 220068, г. Минск, ул. Каховская, 70А, 4-й этаж, к. 417 в рабочие дни с 9.00 до 16.00.

При обращении к Эмитенту с целью ознакомления с Проспектом эмиссии Облигаций потенциальному инвестору (инвестору) представляется Проспект эмиссии Облигаций и/или заверенная копия Проспекта эмиссии Облигаций для обозрения (чтения) с возможностью делать выписки из представленного документа.

Управляющий
ООО «Фабрика Ромакс» ИП Кильчевский С.В.

Главный бухгалтер
ООО «Фабрика Ромакс» Хованская И.В.

УНП 590190426

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** **г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| Продавец | **ОАО «БЗПИ»,** **Минская обл., г. Борисов, ул. Даумана, 97** |

**Предмет аукциона (имущество реализуется одним лотом)**

Производственная база в составе: **проходная, столовая, клуб (**417,9 кв.м, инв. № 610/с-37022), **производственное здание №1** (983,4 кв.м, инв. № 610/С-36970, в т.ч. противопожарный резервуар 150 кв.м), **производственное здание №3** (541,3 кв.м, инв. № 610/С-36984), **производственное здание №4** (580,1 кв.м, инв. № 610/С-36975, в т.ч. дымовая труба), **здание автовесовой** (39,2 кв.м, инв. № 610/С-36988, в т.ч. весы рк 130 (30 тонн), **лаборатория и склад** (120,9 кв.м, инв. № 610/С-36967), **механическая мастерская** (244 кв.м, инв. № 610/С-36954, в т.ч. кузня), **бытовые помещения гаража** (149,8 кв.м, инв. № 610/С-37166), **производственное здание №2** (2160,5 кв.м, инв. № 610/С-388), **трансформаторная подстанция** (32,1 кв.м, инв. № 610/С-37018, в т.ч. наружные сети электроснабжения 1376 м), **административное здание** (343,9 кв.м, инв. № 610/С-37032, в т.ч. автодороги 5982 кв.м, ограждение территории с воротами 207,1 м, забор с двумя калитками 99 м), **склад сырья №1** (428 кв.м, инв. № 610/С-37038), **складские помещения** (84,3 кв.м, инв. № 610/С-36959), **склад сырья №2** (322,2 кв.м, инв. № 610/С-36974), **склад сырья** (83,8 кв.м, инв. № 610/С-36980), **наружные сети канализации** (269,6 м, инв. № 610/С-56281), **наружные тепловые сети** (302,6 м, инв. № 610/С-56282), **внутризаводской водопровод** (239,3 м, инв. № 610/С-56283). В состав предмета аукциона входит **оборудование в количестве 23 единицы** (в соответствии с перечнем оборудования, размещенного на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

**Месторасположение предмета аукциона**:
Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Советская, д. 14а

**Начальная цена с НДС 20% – 369 563 руб. 16 коп. (снижена на 80%)**
(3 695 631 600 бел. руб.)

**Сведения о земельном участке**: предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации зданий и сооружений административного, производственного и бытового назначения производственной базы пл. **1,4378** га с ограничениями в использовании земель – водоохранная зона р. Березина

**Обременения:** частично площади зданий сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано газете **«Звязда» от 30.09.2016**

**Аукцион состоится 28.04.2017 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 26.04.2017 до 17.00** по указанному адресу.
**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

## Вниманию акционеров ОАО «Белгорхимпром»!

**Внеочередное общее собрание акционеров состоится**
**29 декабря 2016 г. в 11.00**
**по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17 в актовом зале.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О внесении изменения в Устав ОАО «Белгорхимпром».
2. Об отмене положения о порядке направления в служебные командировки за границу, утвержденное протоколом общего собрания акционеров ОАО «Белгорхимпром» от 12.05.2008 № 21.

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Киселева, 26а, каб. №407) в рабочие дни в период с 21 по 28 декабря с 13.00 до 15.30, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Регистрация акционеров (их представителей), имеющих право на участие в собрании, – в день проведения собрания **с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17 в актовом зале (3-й этаж).** При себе иметь следующие документы: **акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

УНН 600024712

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот №1. Пшеница фуражная в количестве 41000 кг, начальная стоимость лота – 7835.10 белорусских рублей** |
| **Собственник (владелец) имущества** | Открытое акционерное общество «Обольцы» |
| **Местонахождение имущества** | Витебская область, г. Орша, ул. Кирова, 34. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к заместителю директора ОАО «Оршанский КХП» Банадысеву Андрею Александровичу, тел. 8 (029) 510-09-04 |
| **Наличие обременений** | Не имеется |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 **13 января 2017 года в 14.00** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 15.00 12 января 2017 года.**<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

| | |
|---|---|
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **20 января 2017 года в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, 4-й этаж, малый зал)** |

| № лота | Адрес участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Наличие ограничений в использовании | Начальная цена, руб. | Сумма, подлежащая возмещению организатору аукциона на его проведение, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Юньковский сельисполком Витебская обл., Поставский район, д. Должа, ул. Центральная, 26** | **0,2482** | **224084907801000063** | **Водоохранная зона водного объекта оз. Должа** | **5 000,00** | **1830,16 руб.** |

| | |
|---|---|
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона** | - в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона;<br>- в течение двух месяцев после утверждения протокола аукциона обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений прав на земельный участок, расположенный в водоохранной зоне водного объекта;<br>- получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома;<br>- приступить к занятию земельного участка (начать строительство) в течение года со дня государственной регистрации земельного участка. |
| **Порядок осмотра на местности земельного участка** | В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе.<br>Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб. 11 |
| **Перечень необходимых документов, представляемых участниками аукциона до его начала** | - заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе);<br>- квитанцию об уплате задатка;<br>- ксерокопии стр. 25, 31, 32, 33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования;<br>- представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность |
| **Место, дата и время начала и окончания приема заявлений** | г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб. 11 в рабочие дни с 8.00 до 17.00 со дня публикации извещения по **16 января 2017 года** включительно |
| **Размер задатка, срок и порядок его внесения** | 10% от начальной цены соответствующего участка до подачи заявления на счет сельисполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе |
| **Адрес и номер контактного телефона комиссии** | г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб. 11 в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, телефоны: 8(02155) 43180, 41132 |

# ХТО ДАРОГУ ВЕДАЕ —

## КУП «Гроднааблдарбуд» аднаўляе кіламетры

**Апрабаванне цэментна-бетонных тэхналогій, праца на апярэджанне надвор'я і часу, тэрміновая ліквідацыя крытычных дэфектаў і пастаянны маніторынг стану дарог. Такі тэмп работы дарожнікам Гродзеншчыны, якія выраблююць дарожныя знакі з шаўкаграфіі і маюць уласную формулу пясчана-гравійных сумесяў, даўно звыклы. Абслугоўванне больш за 11 000 кіламетраў трас і рабочыя летнія будні з 7 раніцы да 8 вечара сапраўдных прафесіяналаў не палохаюць.**

### ПАКРЫЦЦЁ — ЖЫВЫ АРГАНІЗМ

Інтэнсіўнасць руху на Гродзеншчыне вышэй, чым у сярэднім па краіне. Гэтая вобласць — другая пасля Мінскай па колькасці аўто ў разліку на жыхара. Прычым з кожным годам павялічваецца не толькі насычанасць руху, а і нагрузка на восьмашыны.

— Большасць айчынных дарог будавалася ў 80-я гады мінулага стагоддзя і была разлічана на рух звычайных грузавікоў з нагрузкай да 6 тон на вось. Цяпер гэтымі ж шляхамі ездзіць цяжкая сельскагаспадарчая тэхніка і самазвалы з нагрузкай на вось 11,5 тоны і болей. Гэта ўдвая большы ціск на пакрыццё, чым планавалася, што і становіцца адной з прычын яго разбурэння, — адзначыў **генеральны дырэктар КУП «Гроднааблдарбуд» Дзмітрый ВАЛКОВІЧ.** — Сёлета, напрыклад, мы выканалі каля 124 000 м² ямачнага рамонту. З аднаго боку, гэта добры паказчык зробленай справы, а з другога — сведчанне таго, што дарогі разбураюцца і працэс стварэння ям вельмі хуткі. Трэба памятаць, што дарожнае пакрыццё — гэта своеасаблівы жывы арганізм, які старэе і хварэе, таму асноўная задача ўтрымання дарог — своечасовая ліквідацыя дэфектаў.

Утрыманне дарог — работа, якая бесперапынна вядзецца круглы год. Напружанне і інтэнсіўнасць працы амаль аднолькавыя ва ўсе сезоны. Летам рамонтам пакрыцця, зразумела, займаюцца больш. Пры гэтым з красавіка па кастрычнік амаль усе суботы — рабочыя. Дарожнікі могуць пачаць у 7 раніцы і скончыць у 8 вечара.

Зімой працы не менш. Мерапрыемствы па ўтрыманні дарог — гэта не толькі расчыстка іх ад снегу, а і высечка небяспечных дрэў, ачыстка прыпынкаў, работы па мастах, тэрміновы ямачны рамонт і іншыя.

У залежнасці ад катэгорыі дарог зімой некаторыя з іх трэба расчышчаць «у нуль» — да самага пакрыцця, а некаторыя дастаткова «адкапаць» на 60%. Пры гэтым існуюць дырэктыўныя тэрміны, у якія дарожнікі павінны ўкласціся, вызваляючы трасу са снежнага палону. На гэта даецца ад 4-х да 12 гадзін.

Каб не падвесці людзей, спецыялісты кругласутачна дзяжураць у дарожна-рамонтных будаўнічых упраўленнях (ДРБУ), а ў некаторых вёсках існуюць дарожна-рамонтныя пункты (ДРП), аддегласць ад якіх да цэнтральных больш за 30 км. Пры гэтым за імі замацаваны ўчасткі па 100–150 км дарог. Як правіла, там працуюць работнікі, якія таксама жывуць у гэтых мясцінах.

— Калі адразу выпадае шмат снегу, нам неабходна быць адначасова ў некалькіх месцах, станавіцца звышаператыўнымі. Мы пастаянна маніторым стан пакрыцця і маем цесную сувязь з ДАІ, — дадаў дырэктар. — Узрастае адказнасць, мы разумеем, што ад нашай працы залежаць чалавечыя жыцці, як бы прыгожа і пафасна гэта ні гучала.

Дарожнікі стараюцца праводзіць прэвентыўныя мерапрыемствы — пасыпаць пакрыццё гадзіны за тры да пачатку галалёду. Як пачне брацца мароз, пясчана-салевыя сумесі ўжо будуць працаваць на дарозе. Асабліва гэта важна, калі зіма толькі пачынаецца і людзі не прызвычаіліся да новых умоў.



**Дзмітрый ВАЛКОВІЧ нарадзіўся ў 1976 годзе. У 1999 г. скончыў Беларускую дзяржаўную політэхнічную акадэмію па спецыяльнасці будаўніцтва дарог і транспартных аб'ектаў. Працаваў у ДРБУ №208 г. Масты майстрам, прарабам, галоўным інжынерам. У 2005–2006 гг. — намеснік начальніка вытворчага аддзела ў Гроднааблдарбудзе. У 2008-м вярнуўся ў Масты начальнікам ДРБУ №208, дзе адпрацаваў шэсць гадоў. З 2014-га два гады быў галоўным інжынерам Гроднааблдарбуда. Са студзеня 2016-га ўзначальвае абласную дарожную арганізацыю.**



У лабараторыі займаюцца распрацоўкай і выпрабаваннем дарожна-будаўнічых матэрыялаў. Тэхнік-лабарант Святлана ДАМБРОВА і тэхнік Рыта ХМЯЛЬНІЦКАЯ на спецыяльным прэсе правяраюць якасць асфальтабетону.

### ВАЙТОПІНГ, АБЯСПЫЛЬВАННЕ І АХОЎНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

Робяць гродзенскія дарожнікі і паверхневую апрацоўку пакрыцця — россып шчэбню на эмульсію, калі па дарозе з-пад колаў выскокваюць камяньчыкі. На думку аўталюбіцеляў, гэта шкодная тэхналогія, аднак спецыялісты лічаць інакш.

— Калі выконваць правілы хуткаснага рэжыму, то і шкло ў машынах будзе цэлым, і ніякіх непрыемнасцяў не здарыцца, — запэўніў Андрэй Станіслававіч. — Праз два тыдні слой сфарміруецца, рэшткі шчэбню змятуцца з дарогі — і можна ехаць з ранейшай хуткасцю.

Ахоўныя слаі асфальтабетону арганізуюць таксама па тэхналогіі ўстройства халодных літых асфальтабетонных сумесяў «Слары Сіл».



Намеснік галоўнага інжынера па якасці Андрэй ІГНАТОВІЧ і загадчыца выпрабавальнай лабараторыі Зіта МАЛАДЗЯНАВА.



Ідзе праца над праектам «Гродна – Сапоцкін». Таццяна ТРАФІМІК — інжынер пашпартызацыі, Ларыса МАНКЕВІЧ — начальнік групы і тэхнік Вікторыя МАРЦУЛЕВІЧ абмяркоўваюць размяшчэнне дарожных аб'ектаў.

Шчэбень перамешваецца з эмульсіяй адразу ва ўстаноўцы і раскладваецца па пакрыцці. У выніку гэтага з-пад колаў не ляцяць камяньчыкі.

Сёлета гродзенскія дарожнікі рабілі на дарогах абяспыльванне гравійнага пакрыцця. Верхні слой разрыхляўся на глыбіню 6-8 см, аўтагудранатарам па паверхні размяркоўвалася бітумная эмульсія, пасля чаго паверхня зноў рыхлілася. І так некалькі разоў. Пасля пакрыццё ўшчыльнілі, а паверхня прыняла выгляд, набліжаны да асфальтабетону.

— У наступным будаўнічым сезоне плануем асвоіць тэхналогію па стабілізацыі цэментам гравійнага пакрыцця з устройствам ахоўнага пакрыцця з асфальтабетону, — дадаў намеснік галоўнага інжынера. — На гравійны размяркоўваецца цэмент са стабілізатарамі (слой 12–18 см), перамешваецца, ушчыльняецца і ўвільгатняецца да аптымальнага ўзроўню, каб паверхня стала маналітнай. Для дадатковай абароны зробім ахоўны слой да 3,5 см з асфальтабетону. Такім чынам, вырашыцца праблема з пылам на дарогах у вёсках і невялікіх пасёлках, палепшыцца якасць гравіек.

Тэхналогію вайтопінгу — устройства цэментабетоннай паверхні па існуючым асфальтабетонным пакрыцці, гродзенскія дарожнікі таксама будуць асвойваць у наступны год. Да эксперыментальнай рэканструкцыі запланаваны адрэзак дарогі ў 1,4 км паміж Путрышкамі і Аульсам (населеныя пункты ў Гродзенскім раёне).

— Гэта новая тэхналогія для Беларусі і першы вопыт для нас, таму БелдарНДІ будзе суправаджаць працу. Яны ўдзельнічалі і ў складанні праекта, — падзяліўся планамі Дзмітрый Валковіч. — Пакрыццё адфрэзеруюць, каб яно адпавядала нарматыўным ухілам, і па яго паверхні бетонаўкладчыкам нанясуць 16–18 см бетоннага слоя.

Для папярэджання ўзнікнення стыхійных шчылін па паверхні дарожнікі наражуць тэмпературныя швы расшырэння (праз 5 метраў) і сціскання (праз 40). Такім чынам, бетону быццам падказваюць месцы, дзе ён павінен трэснуць. У швы палажаць арматуру (каб бетонныя пліты не рухаліся ўверх-уніз) і зальюць іх адпаведнымі матэрыяламі. У выніку карыстальнікі дарог не будуць успрымаць гэты элемент як неэстэтычны і нават не адчуюць яго наяўнасць пад коламі аўто. На паверхню пакрыцця для лепшага счаплення з коламі нанясуць шурпатасць.

### ЗІМОВАЯ ФОРМУЛА ЯМАЧНАГА РАМОНТУ

Сучасныя тэхналогіі дазваляюць выконваць зімой амаль усе работы, што і летам. У прыватнасці, праводзіць тэрміновы ямачны рамонт у месцах, дзе з'явіліся крытычныя дэфекты. Увосень дарожнікі нарыхтоўваюць спецыяльныя аргана-мінеральныя сумесі, састаў якіх тры гады таму яны ўдасканалілі самі. Карыстацца імі можна нават пры 20-градусных маразах. Сёлета ў Гроднааблдарбудзе назапасілі 450 тон такога матэрыялу, які выпускаецца на двух асфальтабетонных заводах арганізацыі.

— Гэта незаменная рэч узімку. У склад сумесі ўваходзіць гранітны шчэбень і адсеў. Вяжучае складаецца з бітуму, які разбаўляецца дызельным палівам, і паверхнева-актыўнага рэчыва — пластыфікатара Азол-1002, што не дазваляе сумесі злежвацца, — расказаў **Андрэй ІГНАТОВІЧ, намеснік галоўнага інжынера па якасці.** — За дзень да прымянення мы ўносім сумесь у цёплае памяшканне, каб яна нагрэлася да пакаёвай тэмпературы. Гэтага дастаткова, каб карыстацца ёй.



Уладзімір ЦЫЛЬКО, намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы. 32 гады таму прыйшоў на працу маладым спецыялістам і ведае кожны абслугоўваемы ўчастак дарогі.

Згодна з нарматыўнай дакументацыяй, гэтыя сумесі лічацца рамонтнымі і вясной іх трэба замяняць шчыльнымі сумесямі. Аднак практыка паказала, што «зімовыя» сумесі добра захоўваюцца і зарэкамендавалі сябе як вельмі трывалыя. Здараецца, яны служаць нават даўжэй,чым тыя, што былі ўкладзены летам, адзначыў спецыяліст.

Для ямачнага рамонту карыстаюцца на прадпрыемстве і струменна-ін'екцыйным спосабам. Для гэтага служаць дзве спецыяльныя ўстаноўкі. Па тэхналогіі гранітны шчэбень фракцыямі 5–10 мм пад ціскам трапляе ў яму і зверху заліваецца бітумнай эмульсіяй, і так у некалькі слаёў.

# НЕ СПАТЫКАЕЦЦА

## і ставіць эксперыменты



Участак дарогі Гродна — Сапоцкін — мяжа Літоўскай Рэспублікі. Быў рэканструяваны за сродкі Еўрасаюза па праграме супрацоўніцтва Польшча — Беларусь – Украіна.

### ЗАТРАТЫ ДЗЕЛЯ БЯСПЕКІ

Абласная праграма па павышэнні бяспекі руху на дарогах прадугледжвае шэраг мерапрыемстваў: стварэнне штучных няроўнасцяў («ляжачых паліцэйскіх») на праблемных скрыжаваннях, устаноўка знакаў, якія абазначаюць накірунак небяспечнага павароту на крывых малога радыуса, наладжванне асвятлення на пешаходных пераходах з інтэнсіўным рухам і ўладкаванне пакрыццяў на дарожках.

— У апошнія тры гады мы робім пешаходныя дарожкі з цэментабетону, хаця першапачатковыя затраты на іх уладкаванне амаль напалову большыя, чым у звычайных асфальтавых. Бетонныя дарожкі жывуць даўжэй, таму ў выніку таннейшыя ў эксплуатацыі. Іх паверхню мы спецыяльна робім шурпатай, бо бетон становіцца слізкім хутчэй, чым асфальт, — зазначыў Дзмітрый Валковіч.

За тры гады зроблена сем такіх дарожак даўжынёй 10,5 км. Сёлета бетонныя сцежкі даўжынёй ад 1,5 да 2 км з'явіліся ў Ваўкавыскім, Лідскім і Навагрудскім раёнах. Арганізавана 98 «паліцэйскіх» на 49 скрыжаваннях, абазначана 44 месцы накірунку небяспечнага павароту з устаноўкай 412 знакаў.

— Гэтыя прылады значна павялічваюць бяспеку на праблемных скрыжаваннях і прымушаюць кіроўцаў зніжаць хуткасць. Гэта, канешне, не самая папулярная мера ўздзеяння, аднак яна працуе, — дадаў Дзмітрый Валковіч.

Месцы, дзе патрэбны першачарговы рамонт, вытворчы аддзел прадпрыемства вызначае з улікам патрэб і пажаданняў райвыканкама.

— Акрамя восеньскіх і вясенніх аглядаў стану дарог і выяўлення пашкоджаных месцаў, якія праводзіць наша служба, мы арыентуемся і на звароты ад грамадзян, якія наракаюць на стан дарог у пэўных месцах. Імкнёмся вырашыць першачарговыя праблемы, — расказала **Тацццяна КОНАН, начальнік планава-эканамічнага аддзела.** — На жаль, мы не можам накрыць асфальтам дарогу, што ідзе, напрыклад, па вёсцы, дзе жыве 10 дачнікаў. Гэта вельмі вялікія грошы, і няма ніякай сацыяльна-значнай і эканамічнай абгрунтаванасці, каб выканаць такую просьбу. Тым больш, што ў нас ёсць яшчэ нават гравійныя трасы, якія злучаюць аграгарадкі з райцэнтрам.

Праблема будаўніцтва аб'язных шляхоў, каб дарогі не праходзілі транзітам праз вёскі і былі больш бяспечнымі для жыхароў, мае, дарэчы, і адваротны бок, патлумачыла спецыяліст:

— Калі зрабіць аб'язны шлях, то старая дарога праз сяло стане другаснай і за яе, хутчэй за ўсё, будзе адказваць сельсавет, у якога менш магчымасцяў падтрымліваць яе ў належным стане. З часам шлях можа прыйсці ў заняпад. Працэй збудаваць «ляжачых паліцэйскіх» і ўсталяваць адпаведныя папераджальныя знакі.

## Пра дзяржпошліну і непатрэбныя расходы

Праблема вандалізму на дарогах застаецца актуальнай шмат гадоў і патрабуе каласальных сродкаў на аднаўленне паламаных і пагнутых знакаў, слупоў, размаляваных павільёнаў. Сёлета на ўборку смецця прадпрыемства выдаткавала каля 5 млрд рублёў на старыя грошы. Гэтыя сродкі можна было б патраціць на рамонт, каб людзям было лепш ездзіць.

*— Мы ніяк не прызвычаімся, што смецць на шляхах нельга. Асабліва брудныя месцы, дзе знаходзяцца дачы садовых таварыстваў, — паскардзіўся дырэктар. — Скарачаючы непатрэбныя траты на ўборку, мы можам за іх адрамантаваць больш пакрыцця, і гэта будзе заўважна. Сёння мы прыбралі смецце, а заўтра новае ляжыць. Крыўдна, што і грошы патрацілі, і працу нашу не заўважылі.*

Існуе ў людзей і непаразуменне, куды расходуюцца сродкі ад дзяржаўнай пошліны за допуск транспартнага сродку да руху.

*— Яны трацяцца толькі на будаўніцтва і рамонт дарог, нават не ідуць на ўтрыманне. Некалькі гадоў таму мы рабілі да 100 км бягучага рамонту ўсёй сеткі па вобласці, цяпер — каля 160 км, а гэта 1,5% ад усёй колькасці дарог. Сёлета мы аддалі на рамонт 164 млрд на старыя грошы з такіх паступленняў. На кожны з 17 раёнаў, што мы абслугоўваем, прыходзіцца прыкладна па 10 млрд. Гэта не так шмат, тым больш што рамантуюцца асобныя кавалкі, і людзі не могуць скласці адрамантаваныя кіламетры, раскіданыя па вобласці, у суцэльную карцінку. У кожным раёне ў сярэднім 270 км асфальтабетоннага пакрыцця — за год мы робім адзін-два ўчасткі, — падкрэсліў Дзмітрый Валковіч. — Гэта як з капрамонтам, на які адлічваюць усе, а рамантуюць асобныя будынкі, да якіх дайшла чарга. Тыя, хто ездзіць па адрамантаваным участку, адчулі нашу працу, тыя, хто не — не бачаць яе.*



Дарожнабудаўнічаму прадпрыемству хапае працы і зімой: акрамя абслугоўвання дарожнага пакрыцця, даводзіцца займацца яшчэ ўборкай дарожных аб'ектаў і вывазам смецця.

### ГІСТОРЫЯ Ў РЭЧАХ І ЗДЫМКАХ

Экспанаты музея гісторыі дарог Гродзеншчыны, створанага на прадпрыемстве, дазваляюць прасачыць эвалюцыю развіцця як прылад дарожнай службы, так і самога пакрыцця дарог. У некранутым выглядзе, так, як яны ляжалі на шляхах, тут захоўваюцца, у прыватнасці, некалькі кавалкаў рознага пакрыцця. Адзін з куточкаў музея адведзены пад прадметы старадаўняй беларускай гаспадаркі: калаўрот, гаршкі, збаны, самавар, прас, радыёла і іншае.

У 2014-м да 70-годдзя Гроднааблдарбуда перад галоўным уваходам на прадпрыемства ўстанавілі скульптуру дарожніка. Аўтар выкананага з сілуміну манумента вагой 300 кг і вышынёй 2,2 м — мясцовы скульптар Уладзімір Панцялееў. На падножжы помніка выбіты словы: «Возводишь дороги, возводишь мосты, ты жизнь улучшаешь, дорожник. А если на трасы взглянуть с высоты, как будто художник создал их».

На гістарычных здымках — даваенныя і пасляваенныя дарогі і збудаванні. Некаторыя з іх хутка можна будзе ўбачыць толькі на фота. Напрыклад, старыя падземныя пераходы, якія адліваліся з бетону прама на месцы. Тады яшчэ не было не тое што гафрыраваных труб, а нават гатовых бетонных кольцаў, таму прыходзілася спраўляцца такім чынам. Затое гэтыя збудаванні маглі б служыць вечна, аднак пры рэканструкцыі дарог з пашырэннем палатна ад іх прыходзіцца пазбаўляцца.

— Такіх канструкцый, канешне, шкада, аднак выйсця іншага няма. Памятаю, пры рэканструкцыі рэспубліканскай дарогі на Брузгі, што ў накірунку Польшчы, прыйшлося дэманціраваць цудоўны арачны мост. Такіх на ўсю Беларусь два ці тры. Аднак ён быў вузкі — ехаць па ім можна было толькі ў адным накірунку, а рух быў вельмі інтэнсіўны, так што мост не адпавядаў патрабаванням часу, — заўважыў **намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы Уладзімір ЦЫЛЬКО.**

### ШЛЯХ МІЖНАРОДНАГА ТУРЫЗМУ

Праектамі па праграме міжнароднага супрацоўніцтва з Еўрапейскім саюзам Гроднааблдарбуд займаецца ўжо сем гадоў. Пару гадоў таму рэканструявалі 11 км аўтадарогі Н6054 Гродна — Сапоцкін — мяжа Польшчы: участак ад Гродна да населенага пункта Рацічы. Пашырылі праезную частку, замянілі пакрыццё, заасфальтавалі абочыны, зрабілі дарожку для веласіпедыстаў. Абсталявалі зручныя пад'езды да прыпыначных пунктаў і аднавілі аўтапавільёны. У выніку дарога змяніла статус чацвёртай катэгорыі на трэцюю.

Гэта асноўны шлях да міжнароднага турыстычнага аб'екта — Аўгустоўскага канала — і месца масавага адпачынку. Па трасе пасля рэканструкцыі ў сезон перамяшчаецца больш за 3 тыс. аўто ў суткі, а прыняты сёлета дазвол на 5-дзённае бязвізавае наведванне канала на нашым баку іншаземнымі турыстамі прывядзе да яшчэ большага наплыву, упэўнены дарожнікі.

— Згодна з правіламі міжнароднага супрацоўніцтва, на аб'екце павінна існаваць яго візуалізацыя, — заўважыў Уладзімір Цылько, паказваючы на аднолькавым участку вялікі стэнд з інфармацыяй пра аб'ект і выявамі выдатных мясцін.

Як толькі адрамантаваны ўчастак, па якім мы ехалі, скончыўся, аўто адчувальна загрукатала коламі па няроўнасцях трасы, якая яшчэ чакае рамонту. Засталося зрабіць два ўчасткі: да гарадскога пасёлка Сапоцкін і непасрэдна да канала. Тут мяркуецца стварыць шырокую абочыну, заасфальтаваць яе і нанесці разметку, каб маглі ездзіць веласіпедысты.

## Знакі з шаўкаграфіі

Філіял Гроднааблдарбуда — арганізацыя «Гроднадарожнік» – адзіная ў вобласці выпускае па тэхналогіі шаўкаграфіі ўласныя дарожныя знакі. Для гэтага выкарыстоўваецца трыэмайская святловяртальная плёнка, якая, як і іншыя матэрыялы для абавязковай сертыфікацыі, сёлета атрымала сертыфікат па патрабаваннях ТРТС 014/2011 «Бяспека аўтамабільных дарог». Цяпер дарожныя знакі гродзенцаў пры жаданні можна экспартаваць за мяжу.

Праўда, колькасць іх выпуску апошнім часам зменшылася амаль удвая — да 530 штук у месяц. Раней рабілі знакі для арганізацый Гродзенскай і іншых абласцей, цяпер амаль толькі для ўласных патрэб прадпрыемства. Вырабляюць знакі і па просьбах іншых арганізацый. Пры гэтым «Гроднадарожнік» яшчэ абслугоўвае больш за 1000 км дарог Гродзенскага раёна.



Працэс вырабу дарожных знакаў з'яўляецца цалкам ручным і патрабуе дакладнасці і ўвагі. Маляр Ала ТАРАСЕВІЧ займаецца гэтым не першы год.



Лідзія СТАНЕЎСКАЯ, майстар участка дарожных знакаў, тлумачыць, як адбываецца стварэнне знакаў і як зрабіць іх больш устойлівымі.

**Ірына СІДАРОК.** sidarok@zviazda.by
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**

УНП 500036511

■ Спорт-тайм

# Трыумфальнае вяртанне чэмпіёна

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра тое, наколькі паспяхова пачалі сезон нашы фрыстайлісты, як згуляла беларуская «маладзёжка» на чэмпіянаце свету па хакеі і якое месца заняла нацыянальная зборная на «Турніры чатырох нацый».**

**1.** ***Алімпійскі чэмпіён Антон Кушнір стаў пераможцам першага этапу Кубка свету па фрыстайле ў кітайскім Бейда Лэйк.*** У фінале ён паказаў найлепшы вынік, апярэдзіўшы кітайцаў Ці Гуанпю і Чжоў Ханя. Гэты поспех стаў першым у кар'еры Кушніра пасля Алімпіяды 2014 года.



Нагадаем, доўгі час Антон аднаўляўся пасля траўмы.

У жаночых спаборніцтвах першага этапу Кубка свету па лыжнай акрабатыцы беларуска Ганна Гуськова заняла 5-е месца, Аляксандра Раманоўская стала 16-й.

Другі этап Кубка свету прайшоў там жа 18 снежня і зноў беларускі спартсмен апынуўся на п'едэстале. На гэты раз Максім Гусцік паказаў трэці вынік, а астатнія прадстаўнікі нашай каманды не трапілі ў дзясятку наймацнейшых.

**2.** ***Алена Ляшкевіч стала чэмпіёнкай свету па муай-тай сярод прафесіяналаў у вагавай катэгорыі да 45 кг.*** Фінальны бой адбыўся ў Ганконгу, саперніцай беларускі стала Гандзі Ву з Кітая.

Адзначым, што раней Алена Ляшкевіч станавілася чэмпіёнкай Еўропы і свету сярод аматараў.

**3.** ***Хакеісты зборнай Беларусі сталі другімі на «Турніры чатырох нацый» у Швейцарыі.*** У стартавым паядынку яны разграмілі каманду Славакіі — 7:1, а вось у фінальнай гульні са зборнай Швейцарыі ўжо самі моцна саступілі гаспадарам лёду — 1:6.

У гульні за 3-е месца славацкія хакеісты ўпэўнена перайгралі каманду Францыі — 6:1.



**4.** ***Маладзёжная зборная Беларусі (U-20) заняла першае месца на чэмпіянаце свету па хакеі ў дывізіёне I групы А і заваявала права згуляць у наступным сезоне ў эліце.*** У заключнай гульні на турніры ў нямецкім Брэмерхафене падапечныя Юрыя Файкова сталі мацнейшымі за сапернікаў з Аўстрыі — 4:0.

*— Калі шчыра, яшчэ не ў поўнай меры ўсвядомілі тое, што заваявалі чэмпіёнства на турніры. Усё засталося на лёдзе, нават няма сіл на нейкія эмоцыі. Пасля гульні сказалі хлопцам, што яны самыя лепшыя, і гэта сапраўды так. Усе хлопцы згулялі на высокім прафесійным узроўні. У чым наш сакрэт поспеху? Ён просты: вельмі цяжкая праца ўсёй каманды на працягу апошніх сямі месяцаў і безумоўная ўзаемная вера адзін у аднаго паміж трэнерскім штабам і гульцамі,* — прыводзіць словы настаўніка прэс-служба Федэрацыі хакея Беларусі.

**5.** ***«Раўбічы» могуць прыняць этап Кубка свету — 2016/2017, калі гэтыя спаборніцтвы перанясуць з расійскай Цюмені.*** Як заявілі ў эфіры тэлеканала «Беларусь 5», Міжнародны саюз біятланістаў (IBU) склаў спіс з магчымых кандыдатаў на замену Цюмені. У гэтым пераліку фігуруе і беларускі біятлонны комплекс.

Раней беларускі бок ужо прапаноўваў IBU праводзіць у Раўбічах этапы Кубка свету як на рэгулярнай аснове, так і ў выпадку экстранай неабходнасці змены месца правядзення спаборніцтваў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Будзе свята!

# Падарункі пад... піхтай

Сёлета, акрамя ёлак і соснаў, дамы беларусаў упрыгожаць і піхты.

— Раней гэта дрэўца лічылася навагоднім сімвалам у асноўным у еўрапейскіх краінах, цяпер карыстаецца попытам і ў нас. Пакуль асартымент у лясгасах невялікі, мы толькі пачынаем працаваць з адпаведным пасадачным матэрыялам. Калі ёлка дасягае метра за 4—5 гадоў, то піхце на гэта спатрэбіцца 10—12. У лясгасах дрэва вышынёй да метра каштуе прыблізна 40 рублёў, — расказала **кансультант упраўлення лясной гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі Марыя ГЕРАСІМЕНКА**.

Калі ж гаварыць пра звыклыя ёлкі, то спецыяльнымі навагоднімі плантацыямі сёння занята каля 800 гектараў. З 2 мільёнаў дрэўцаў больш за 175 тысяч дасягнулі адпаведных параметраў для рэалізацыі. З 21 снежня ў рэгіёнах будзе арганізавана каля 1100 гандлёвых пунктаў, 20 з іх — у Мінску. Кошт дрэўцаў вышынёй ад аднаго да двух метраў складзе 8—10 рублёў, яшчэ танней ёлкі абыдуцца, калі набываць іх у лясніцтвах.

З 15 снежня дзяржаўная лясная ахова перайшла на ўзмоцнены рэжым кантролю лясоў з мэтай не дапусціць незаконныя высечкі і вываз дрэў без адпаведных дакументаў. Разам з супрацоўнікамі МУС, Мінпрыроды, Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і іншымі кантралюючымі органамі планучецца правесці больш за 1800 рэйдавых мерапрыемстваў, выставіць звыш 300 кантрольных пастоў. Будуць выкарыстоўвацца фота- і відэапасткі. Сёння ў лясгасах задзейнічана каля 470 такіх прыстасаванняў, з пачатку 2016 года з іх дапамогай было выяўлена і прыцягнута да адказнасці каля 160 парушальнікаў. У перадНавагодні перыяд прыборы відэафіксацыі размесцяць каля садаводчых кааператываў, іншых участкаў, дзе часта адбываюцца незаконныя высечкі. Штраф за ссечанае без дазволу дрэўца складзе ад 5 да 50 базавых велічынь.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

**20 СНЕЖНЯ**

**1840** год — нарадзіўся (в. Дамброва, цяпер у Шчучынскім раёне) Казімір Дамінікавіч Альхімовіч, беларускі жывапісец і ілюстратар. Прадстаўнік позняга рамантызму і рэалізму ў беларускім жывапісе XIX — пач. XX ст. Вучыўся ў Віленскай гімназіі. За ўдзел у паўстанні 1863—1864 гг. сасланы ў Сібір. Пасля вяртання жыў у Варшаве, Парыжы. Працаваў у міфалагічным, гістарычным, партрэтным жанрах. Праявіў сябе як майстар эмацыйна-псіхалагічнага вобраза. Аўтар гістарычных палотнаў: «Пахаванне Гедыміна», «Пасля бітвы», «Смерць Глінскага ў турме» і інш. Па матывах творчасці А. Міцкевіча стварыў серыю карцін і 12 ілюстрацый да яго паэмы «Пан Тадэвуш». Вядомы як ілюстратар твораў Ю. Славацкага і Ю. Крашэўскага. Памёр у 1916 годзе.

**1920** год — па загадзе старшыні ВЧК Фелікса Дзяржынскага створаны замежны аддзел у сістэме Усерасійскай надзвычайнай камісіі, заснаваны за тры гады да гэтага. Задачай аддзела стала вядзенне знешняй разведкі.



**1928** год — Уладзіславу Іосіфавічу Галубку першаму ў Беларусі прысвоена ганаровае званне народнага артыста Беларускай ССР.

**1945** год — зацверджаны статут Міжнароднага ваеннага трыбунала, на падставе якога быў праведзены Нюрнбергскі працэс над галоўнымі ваеннымі злачынцамі фашысцкай Германіі; Такійскі працэс для вынясення прысуду галоўным японскім ваенным злачынцам, а таксама судовыя працэсы аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў у СССР і іншых краінах.

**1946** год — 70 гадоў таму нарадзіўся Сяргей Аляксеевіч Сергачоў, беларускі архітэктар, доктар архітэктуры, прафесар. У 1969 годзе скончыў БПІ. У 1977—1983 гадах — кіраўнік рабочай групы па стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Адзін са стваральнікаў музейнага комплексу «Дудуткі». Даследуе гісторыю народнай архітэктуры Беларусі, праблемы захавання гісторыка-культурнай спадчыны, развіцця традыцый у сучаснай архітэктуры. Аўтар шэрагу праектаў рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры.

Было сказана

**Аркадзь КУЛЯШОЎ, народны паэт Беларусі:**

*Выток і рэк, і шляхоў адзіны:*
*Ад непрыкметнае ручаіны*
*Паходзяць плыні*
*рэк паўнаводных,*
*Шляхі — ад рэчышчаў першаходных.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.26 | 16.49 | 7.23 |
| Віцебск — | 9.23 | 16.31 | 7.08 |
| Магілёў — | 9.16 | 16.39 | 7.23 |
| Гомель — | 9.04 | 16.44 | 7.40 |
| Гродна — | 9.40 | 17.06 | 7.26 |
| Брэст — | 9.32 | 17.15 | 7.43 |

## Месяц

*Поўня 14.12—20.12.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Імяніны

***Пр.*** *Антона, Івана, Міхаіла, Паўла, Сяргея.*
***К.*** *Багумілы, Дамініка, Ігната, Яўгена.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

Вовачка крычыць з ваннага пакою:

— Мама, ты мне якую кашулю папрасавала? З кароткімі рукавамі ці з доўгімі?

— З кароткімі, а чаму ты пытаешся?

— Каб ведаць, дакуль рукі мыць.

**— Люся, нам трэба часова развітацца.**

**— Ты мяне больш не кахаеш?**

**— Не, проста хутка Новы год, у мяне няма грошай на такія выдаткі.**

— Вось скажы, што паміж намі агульнага? Я люблю шумныя кампаніі, ты — ціхая дамаседка. Я люблю фільмы, ты — у кутку кніжку пачытаць. Я люблю Высоцкага, ты яго цярпець не можаш. Я люблю кошак, ты — сабак. Я люблю футбол, ты яго ненавідзіш... Ну скажы — што ў нас агульнага?

— Дзеці.

**«Ці адзначаць гадавіну вяселля пасля разводу?» і іншыя крэатыўныя падставы выпіць.**




Малюнак Пятра КОЗІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Першы намеснік дырэктара — галоўнага рэдактара Алена Леанідаўна ЛЯЎКОВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 5006.

Нумар падпісаны ў 19.30 19 снежня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12